*І. Н. Колабава*
(Мінск)

# Да пытання фальсіфікацыі расійскіх манет і папяровых грошай на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. (паводле архіўных матэрыялаў)

Грашовая гаспадарка на тэрыторыі Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) і ўваходжанні гэтых зямель у склад Расійскай імперыі ўяўляла даволі стракатую карціну. Яе спецыфіка была абумоўлена тым, што мясцовае насельніцтва ў гэты перыяд традыцыйна выкарыстоўвала звыклы набор манет, які ўключаў як уласныя, так і значную колькасць эмісій замежнага паходжання. Значнае месца ў грашовым абарачэнні займалі чаканка Варшаўскага манетнага двара часоў герцагства Варшаўскага і Каралеўства Польскага, а таксама расійская манета.

Урад праводзіў адносна лаяльную палітыку да ўключэння мясцовай грашовай гаспадаркі ў рэчышча расійскага рынку. У цэлым яна прадугледжвала паступовы перавод беларускага насельніцтва на выкарыстанне толькі расійскіх сродкаў абарачэння.

У 1831 г. з'яўляецца ўрадавая пастанова «Об исчислении определенной в Литовском Статуте монеты во всех случаях, где взыскание производится по Литовскому Статуту». У 1844 г. дзяржаўныя ўлады запатрабавалі ад мясцовага насельніцтва здачу ў казну іншаземнай манеты, але працэс расцягнуўся да 1847 г.[14, с. 173].

Насычанасць манетнай сістэмы разнастайнымі грашовымі сродкамі садзейнічала актывізацыі дзейнасці фальшываманетчыкаў.

Вядомы расійскі юрыст А. Ф. Коні піша, што падробка грашовых знакаў, з першага погляду, не парушае непасрэдна нічыіх правоў, але на самай справе ад гэтага злачынства пакутуе і асоба, і ўсё грамадства [9, с. 297]. У той жа час ён справядліва заўважае, што «фальшивые бумажки, как бы плохо они не были сделаны… представляют известную ценность, они стоят, в смысле труда, дорого, и подделка их сопряжена с большим риском» [9, с. 301]. А. Ф. Коні выкарыстоўвае вельмі цікавае параўнанне, гаворачы, што «фальшивые ассигнации похожи на сказочный клубок змей. Бросил его кто-либо в одном месте, а поползли змейки повсюду…» [9, с. 324].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Большасць разгледжаных ніжэй архіўных спраў, пацвярджаючы гэтыя словы, утрымліваюць матэрыялы даследавання шляхоў распаўсюджвання фальсіфікатаў па тэрыторыі Беларусі.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў фондах канцылярый Віцебскага (ф. 1430), Мінскага (ф. 295), Магілёўскага грамадзянскіх губернатараў (ф. 2001), генерал-губернатара Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага (ф. 1297), Мінскага галоўнага суда і дэпартамента (ф. 76) захавалася значная колькасць спраў з інфармацыяй аб абарачэнні на тэрыторыі Беларусі фальшывых расійскіх манет, асігнацый і крэдытных білетаў.

Пры класіфікацыі архіўных спраў, што маюць адносіны да фальшываманетніцтва, можна вызначыць наступныя групы: справы па фальсіфікацыі манет і справы па падробцы папяровых грашовых знакаў. У сваю чаргу з гэтых груп можна вылучыць: а) справы з апісаннем уласцівасцей фальшывых папяровых грашовых знакаў, складзеных цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі; б) справы з апісаннем следчых мерапрыемстваў па даследаванні дзейнасці фальшываманетчыкаў; в) справы з інфармацыяй аб фальсіфікацыі папяровых грошай у замежжы.

Вывучэнне кожнай з груп дазваляе вызначыць асноўныя тэндэнцыі развіцця працэсу фальсіфікацыі грашовых знакаў на тэрыторыі Беларусі, разгледзець разнастайныя аспекты фальшываманетніцтва як сацыяльна-эканамічнай з’явы.

Так, напрыклад, у фондзе канцылярыі Віцебскага грамадзянскага губернатара налічваецца каля 55 тыс. адзінак захоўвання. З іх 118 спраў утрымліваюць звесткі аб дзейнасці фальшываманетчыкаў (14 выпадкаў датычаць падробкі манет, а ў 104 ідзе гаворка аб фабрыкацыі папяровых грошай).

Гэтыя суадносіны сведчаць аб больш значных маштабах падробкі менавіта папяровых грошай у параўнанні з фальсіфікацыяй манет.

Шэраг спраў утрымліваюць апісанне ўласцівасцей фальшывых крэдытных білетаў рознай вартасці. Вырабляліся яны звычайным літаграфічным спосабам з выкарыстаннем матрыц, выразаных на металічных досках.

Папяровыя фальсіфікаты мелі граматычныя памылкі і скажэнні выяў. Верагодна, фальшываманетчыкі разлічвалі на тое, што чалавек, як правіла, не звяртае асаблівай увагі на тэкст і дакладнасць выяў на банкнотах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеянні дзяржаўных улад у выпадках выяўлення фальсіфікатаў падлягалі адпаведнаму алгарытму. У справе, адкрытай паводле рапарту Віцебскай гарадской паліцыі 26.01.1855 г. у адносінах да падазронага крэдытнага білета ў 10 рублёў, паведамляецца аб мерах засцярогі з боку ўлад, распачатых у выпадках выяўлення фальшывых крэдытных білетаў. Следства аб «делателях и переводителях» падробак магло пачацца толькі ў выпадках, «когда билет окажется грубой подделки, так что подложность его видна с первого взгляда, а если на счет кредитного билета возникнет сомнение, то от предъявителя его, не обнаруживая подозрения, брали только показание: откуда им получен такой билет». Падазроная купюра тэрмінова адпраўлялася ў Праўленне дзяржаўных крэдытных білетаў на экспертызу, а да следства мясцовыя ўлады маглі прыступаць толькі пасля атрымання спецыяльнага паведамлення. Урад асцерагаўся «повредить свободному обращению кредитных билетов» і, такім чынам, падарваць давер да іх насельніцтва [10, арк. 7].

У дакументах адзначана прафілактычная работа дзяржаўных органаў па папярэджанні падобнага роду злачынстваў і неаднаразовыя спробы губернскіх улад розных рэгіёнаў аб'яднацца ў барацьбе з фальшываманетніцтвам, арганізуючы сумесныя акцыі па спыненні гэтага злачынства.

11.11.1858 г. магілёўскі губернатар звярнуўся да віцебскіх улад з паведамленнем аб тым, што «в г. Могилеве открыт и взят делатель фальшивой звонкой монеты, по преимуществу серебряных рублей; сверх того в г. Копыси и Оршанском уезде открыты делатели и переводители фальшивых кредитных билетов, причем взяты фальшивые билеты 10-ти р[уб]. и 50-ти рублевого достоинства на сумму 8170 руб. и разные снаряды, служивые для подделки 5-ти и 10-ти, и 50-ти рублёвых билетов» [11, арк. 155]. Магілёўскія ўлады прапаноўвалі правесці на віцебскай тэрыторыі сумесныя следчыя мерапрыемствы.

Вывучэнне матэрыялаў фондаў дазваляе разам з іншым прасачыць следчыя мерапрыемствы па даследаванні дзейнасці фальшываманетчыкаў, а таксама атрымаць інфармацыю аб самім працэсе вырабу фальшывых грашовых знакаў. У справах даволі часта ўзгадваюцца выпадкі знаходжання манетных паўфабрыкатаў і прылад, неабходных для работы фальсіфікатараў.

Фальсіфікацыя крэдытных білетаў, як сведчаць архіўныя дакументы, праводзілася не толькі ўнутры краіны, але і па-за яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межамі, напрыклад, у Англіі і Германіі. Транспарціроўка фальшывак праз граніцу мела высокую ступень рызыкі, таму натуральна, што падробцы за межамі ў асноўным падлягалі буйныя купюры. Паказальна, што на тэрыторыю Расійскай імперыі, напрыклад з Лондана, увозіліся не толькі самі фальсіфікаты, але і папера для вырабу на месцы падробак невялікіх наміналаў 5-, 10- і 25-рублёвай вартасці.

Часам дакументы даюць рэдкую мажлівасць падлічыць прыбыткі, якія можна было атрымаць ад рэалізацыі фальшывых купюр.

У шэрагу спраў разглядаліся сувязі мясцовых фальсіфікатараў з нелегальнымі замежнымі цэнтрамі па выпуску падробных расійскіх крэдытных білетаў.

Напрыклад, у рапарце дынабургскага павятовага іспраўніка віцебскаму губернатару ад 18.07.1880 г. адзначалася, што ў г. Дынабургу «производится торговля фальшивыми кредитными билетами, привозимыми из Англии» [12, арк. 21]. У пачатку 1882 г. Міністэрства фінансаў накіроўвае віцебскаму губернатару паведамленне аб арышце «в Лондоне и Берлине делателей и сбытчиков русских кредитных фальшивых билетов», вядомых па аналагічных справах у Віцебскай губерні [13, арк. 28–28 адв.].

Такім чынам, аналізуючы сабраны матэрыял, можна зрабіць пэўныя высновы аб шырокам распаўсюджванні на тэрыторыі Беларусі XIX в. такой з’явы, як выраб і выкарыстанне расійскіх фальшывых манет і папяровых грашовых знакаў [1–8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Колабава, І. Н.* Апісанне ўласцівасцей фальшывых крэдытных білетаў у справах фонду канцылярыі Віцебскага грамадзянскага губернатара (1840–1850-я гг.) / І. Н. Колабава // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канф., прысвечанай 50-годдзю знаходжання берасцяной граматы і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага. Віцебск, 23–24 кастр. 2009 г. – Віцебск, 2010. – С. 161– 165.

2. *Колабава, І. Н.* Падробка расійскай манеты ў Мінску ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / І. Н. Колабава // Мінск і мінчане: 10 стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам Магдэбургскага права і 65-годдзя вызвалення горада ад германскіх акупантаў. Мінск, 5–6 вер. 2009 г. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – С. 77–79.

3. *Колабава, І. Н.* Полацкія фальшываманетчыкі першай паловы XIX ст. / І. Н. Колабава // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. Полацк, 24–25 кастр. 2007 г. – Полацк, 2009. – С. 100–102.

4. *Колабава, І. Н.* Удзел фальшываманетчыкаў Віцебскай губерні ў дзейнасці замежных цэнтраў па вытворчасці падробных расійскіх крэдытных білетаў у другой палове XIX ст. / І. Н. Колабава // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф. – Мінск : Медысонт, 2009. – С. 56–61.

5. *Колобова, И.* Зарубежные центры по подделке российских кредитных билетов (вторая половина XIX в.) / И. Колобова // Pieniądz –kapitał – praca – wspólnedziedzictwo Europy– Białorus – Litwa – Łotwa – Polska – Rosja – Słowacia, Ukraina : materiały z VIII Międzynarodowej Konferencj i Numizmatycznej, Białystok–Augustów 18–21września 2008. – Warszawa, 2008. – S. 193–197.

6. *Колобова, И.* Подделка российской монеты в Беларуси в 18 – первой половине 19 в. / И. Колобова // Международная нумизматическая конференция, посвященная 150-летию Национального музея Литвы. Вильнюс, 26–28 апр. 2006 г. – Вильнюс, 2010. – С. 367–370.

7. *Колобова, И.* Фальшивые российские кредитные билеты на территории Витебской губернии во второй половине XIX в. / И. Колобова // XV Всероссийская нумизматическая конференция : тезисы докладов и сообщений, Ростов-на-Дону, 20–25 апр. 2009 г. – М., 2009. – С. 195–196.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Колобова, И.* Н.Фальшивые российские монеты и ассигнации в Витебской губернии первой половины XIX в. / И. Н. Колобова // XIV Всероссийская нумизматическая конференция : тезисы докладов и сообщений, Санкт-Петербург, 16–21 апр. 2007 г. – СПБ., 2007. – С. 205–206.

9. *Кони, А. Ф.* По делу о Станиславе и Эмиле Янсенах, обвиняемых во ввозе в Россию фальшивых кредитных билетов, и Герминии Акар, обвиняемой в выпуске в обращение таких билетов / А.Ф. Кони // Избранные произведения / А. Ф. Кони. – М. : Гос. изд-во юридич. лит., 1958. – Т. 1. – С. 287–324.

10. *НГАБ.* – Ф. 1430. – Оп. 1. – Д. 27 133 (Дело по рапорту Витебской городской полиции о сомнительном кредитном билете в 10 рублей).

11. *НГАБ.* – Ф. 1430. – Оп. 1. – Д. 30 391 (Дело по рапорту Витебского земского исправника о проведении обыска…и о найденных… фальшивых деньгах).

12. *НГАБ.* – Ф. 1430. – Оп. 1. – Д. 36 620 (Дело о появлении в обращении фальшивых кредитных билетов в г. Динабурге и уезде).

13. *НГАБ.* – Ф. 1430. – Оп. 1. – Д. 36 853 (Дело о ввозе из-за границы фальшивых кредитных билетов).

14. *Рябцевич, В. Н.* О чем рассказывают монеты / В. Н. Рябцевич. – Минск : Народная асвета, 1977. – 399 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ